3. Самсонова, С. А. «Fin de siecle»: культурологическая дефиниция и художественные практики : автореф. дис. … канд. культурологии : 24.00.01 / С. А. Самсонова ; Костром. гос. ун-т. – Кострома, 2003. – 23 с.
4. Синило, Г. В. Экклесиаст как метатекст эпохи барокко / Г. В. Синило // Экклесиаст и его рецепция в мировой культуре : в 2 ч. Ч. 2. Экклесиаст в мировой поэзии: от Поздней Античности до Раннего Нового Времени / Г. В. Синило. – Минск : БГУ, 2013. – С. 159–185.
5. Шопенгауэр, А. Мир как воля и представление / А. Шопенгауэр ; пер. с нем. Ю. И. Айхенвальда [и др.]. – Минск : Литература, 1998. – 1405 с.

УДК 930.85(476)“15/165”:[27-18+316.61]

# АСАБЛІВАСЦІ КАНЦЭПТУАЛІЗАЦЫІ АСОБЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ ЭПОХІ АДРАДЖЭННЯ

***Таісія Сухоцкая***
*Мінск, Беларусь*

Сцвярджаецца, што ў беларускай культуры эпохі Адраджэння адбываецца толькі афармленне асобы, вылучаюцца галоўныя феномены працэсу канцэптуалізацыі (вальнадумства, рэлігійная свабода, хрысціянская маральнасць, сацыяльная дэтэрмінаванасць чалавека і інш.).

***Ключавыя словы: асоба, канцэптуалізацыя, Адраджэнне, “хрысціянскі гуманізм”.***

Фарміраванне канцэпцыі беларускай асобы эпохі Адраджэння стала заканамерным вынікам сацыяльна-эканамічнага і духоўна-культурнага развіцця беларускага грамадства XVI – першай паловы XVII ст. М. Бярдзяеў, які разглядаў асобу як духоўную сутнасць і якасць чалавека, падкрэсліваў, што ў рэнесанснай мадэлі, з аднаго боку, адбываецца ўзвялічванне чалавека, яго розуму, прыгажосці, сілы, а з другога – чалавек забывае, што ён толькі вобраз і падабенства Боскае [1, с. 97]. Разам з тым “універсальны чалавек” эпохі Адраджэння – гэта яшчэ не асоба, а толькі яе афармленне, канцэптуалізацыя. Рэнесанс, на думку Л. Баткіна, не змог дабудаваць гераічнае і натуралістычнае разуменне індывіда да паняцця асобы [2, с. 226]. Непаўната, няяўнасць рэнесанснага чалавека – гэта не адлюстраванне яго непаўнавартаснасці ў параўнанні з асобай Новага часу. Наадварот, менавіта ў гэтым заключана яе асаблівасць, што робіць асобу эпохі Адраджэння “тытанічнай”, “бязмежнай”, рэнесанснай.

Важнейшымі кампанентамі беларускага Рэнесансу (XVI – першая палова XVII ст.) становяцца ідэі інтэлектуальнага і маральнага ўдасканалення чалавека ў кантэксце яго прыналежнасці да хрысціянскай культуры; грамадскага і рэлігійнага міру і згоды; сінтэзу ідэалаў Усходу і Захаду; каштоўнасць зямнога жыцця чалавека і гарманічных адносін з акаляючай рэчаіснасцю, нацыянальнай духоўнай культуры і мовы.

З пункту культурна-тыпалагічнага гледжання Беларусь можа быць аднесена да рэгіёна Паўночнага Адраджэння, асаблівасцямі якога з’яўляюцца сувязь з Рэфармацыяй, рэлігійна-этычная тэндэнцыя, істотная залежнасць ад феадальна-сярэднявечнай традыцыі. У той жа час усходнееўрапейскі рэгіён адзначаны такімі асаблівымі рысамі развіцця матэрыяльнай і духоўнай культуры, якія прымушаюць выдзяляць яго ў якасці адносна самастойнага.

Такім чынам, поруч з праблемай Паўночнага Адраджэння павінна разглядацца і праблема ўсходнееўрапейскага Рэнесансу, а ў яе межах – праблема Рэнесансу ўласна беларускага. З’яўляючыся адзінствам агульнаеўрапейскага і рэгіянальна-нацыянальнага, Адраджэнне ў Беларусі мела свае спецыфічныя рысы – меншая ўдзельная вага свецкага

пачатку, сутыкненне ўсходніх і заходніх рэлігійна-царкоўных і духоўна-культурных тэндэнцый, станаўленне беларускай культуры ў складзе поліэтнічнага і рознарэлігійнага інтэграванага дзяржаўнага ўтварэння. Асаблівасцю працэсу развіцця айчыннай рэнесанснай культуры ў параўнанні з культурай Заходняй і Цэнтральнай Еўропы з'яўлялася спазненне яе развіцця, функцыянаванне яе ва ўмовах каталіцкай экспансіі і Контррэфармацыі, культуры барока, што развівалася ў Беларусі ў канцы XVI – першай палове XVII ст. Адным з істотных момантаў Адраджэння ў Беларусі з'яўляецца станаўленне нацыянальнай, уласна беларускай культуры. Айчынны рэнесансны гуманізм часцей за усё прымаў выгляд «хрысціянскага гуманізму», г. зн. светапогляду, які, не парываючы з асноўнымі прынцыпамі хрысціянства, імкнуўся рэвізаваць некаторыя яго традыцыйна-сярэднявечныя ўяўленні і паняцці.

Паняцце беларускай асобы развівалася ў рэнесансна-гуманістычнай культуры Беларусі, якой былі характэрны рэлігійны рацыяналізм і вальнадумства, часткова атэізм і матэрыялізм, гуманізм. У працах беларускіх мысліцелей разглядаліся пытанні адносін чалавека з Богам, грамадствам, абмяркоўваліся пытанні шчасця і сэнсу жыцця, агульнага і індывідуальнага дабра, маральнай свабоды, выбару, адказнасці, маральнага і інтэлектуальнага ўдасканалення, грамадзянскага абавязку і інш. (Ф. Скарына, М. Гусоўскі, А. Волан, Якуб з Калінаўкі, С. Полацкі). У гэтым кантэксце развівалася ўяўленне пра спецыфічныя уласцівасці менавіта беларускай асобы эпохі Адраджэння. Сярод перадумоў яе фарміравання, у першую чаргу, можна вылучыць такія феномены як вальнадумства, рэлігійная свабода, рэнесансная маральнасць, цялеснасць і сацыяльнасць асобы.

Перш за ўсё трэба падкрэсліць, што беларускі рэнесансна-гуманістычны ідэал не атэістычны, ці антыхрысціянскі. Вера выступае ў якасці неабходнага кампаненту ідэальнай асобы, аднак асоба гэтая ўжо дастаткова секулярызаваная. Феномен вальнадумства як права чалавека на самастойную думку, уласны выбар, на асабісты пошук ісціны з'яўляўся важнейшай рысай канцэптуалізацыі беларускай асобы эпохі Рэнесансу. Вальнадумтва было звязана, у першую чаргу, з вылучэннем асабаснага мыслення, носьбітам якога безумоўна з'яўляўся Францыск Скарына. Скарынінская Біблія – першае ў айчыннай культуры свецкае выданне Святога Пісання, ажыццяўлёнае, як адзначае У.М. Конан, «без аглядкі на царкоўную цэнзуру» [3, с. 35]. Заўважым, што пазацаркоўнае выданне Бібліі ўжо само па сабе з'яўляецца сведчаннем вальнадумства беларускага друкара, паколькі да XVI ст. тлумачэнне Святога Пісання лічылася прэрагатывай царквы і духавенства. Пры ажыццяўленні свайго выдавецкага праекта Скарына дапускае шматлікія «вольнасці»: адыходзіць ад кананічнага парадку біблейскіх кніг, па-гуманістычнаму тлумачыць шматлікія біблейскія сюжэты, вольна звяртаецца з тэкстам, прапускаючы ці перастаўляючы па сваім меркаванні цэлыя фрагменты і часткі.

Трэба звярнуць увагу і на тую акалічнасць, што шматлікія гравюры Скарыны насычаны не столькі тэалагічным, сколькі зямным сэнсам. Безумоўнай рысай рэнесанснага вальнадумства варта лічыць гравюрны партрэт Ф. Скарыны, у якім ён сцвярджае сваю індывідуальнасць. У ключы вальнадумства варта разглядаць і скарынінскія прадмовы, пазбаўленыя вельмі характэрнага для сярэднявечных хрысціянскіх артадаксальных пісьменнікаў і перапісчыкаў прыёму літаратурнага самаўніжэння. Насупраць, велізарнае значэнне для Скарыны мае творчае самавыяўленне. Прыгадаем, што ў якасці ідэальнай асобы ў яго выступае біблейскі персанаж Ісус Сірахаў, які турбуецца пра тое, каб выявіць сябе ў творчасці і пакінуць «по собе паметь, яко и предкове его оставили суть, дабы паметь его не загинула вовеки» [4, с. 24].

Пэўны крок у рацыяналізацыі асабаснага быцця робіць Мікола Гусоўскі. У паэме «Песня пра зубра», зыходзячы з натуралістычнага прынцыпу вытлумачэння рэчаіснасці, ён адвяргае ўсё фантастычнае і звышнатуральнае, у прыватнасці рэальнасць падзей антычнай міфалогіі, народных легенд, веру ў чараўнікоў, ведзьмаў, забабоны.

У гэтым ракурсе неабходна таксама разгледзець канцэпцыю Сымона Буднага, у рамках якой мысліцель неаднаразова бярэ пад сумненне тыя месцы Бібліі, якія

супярэчаць не толькі розуму, але і прыродным дадзеным. Звышнатуральныя сітуацыі ён імкнецца тлумачыць зыходзячы з умоў рэальнага быцця. Адпаведнасць з прыродай выступае ў яго як адно з асноўных патрабаванняў пры ацэнцы таго ці іншага біблейскага сюжэта. Хрысталогія Сымона Буднага «Аб найгалоўнейшых палажэннях хрысціянскай веры» падводзіла да думкі пра абмежаваныя магчымасці Творцы, фактычна адмаўляла тварэнне «з нічога» і ў канчатковым выніку мела перадумовы для станаўлення ідэі аб'ектыўнай заканамернасці.

Карэнным чынам разыходзіўся С. Будны з хрысціянскай артадоксіяй у трактоўцы Хрыста. Ён выключыў яго з надсусветнага пачатку, не прыняў яго боскае паходжанне і звышнатуральнае нараджэнне. На нашу думку, у такім падыходзе Сымона Буднага сцвярджаецца неабмежаванасць магчымасцяў чалавека, а асоба Хрыста выступае дасягальным прыкладам чалавечай самаадданасці і высокамаральнасці.

Такім чынам, развіццё вальнадумства ў беларускай філасофскай думцы эпохі Адраджэння дазваляе нам гаварыць аб рацыяналізацыі, секулярызацыі і натуралізацыі асобы, яе праве на ўласнае меркаванне і самаразвіццё.

Важнай катэгорыяй у працэсе фарміравання беларускай асобы з'яўляецца паняцце свабоды. Неабходна адзначыць, што ў адрозненне ад еўрапейскага ў айчынным Адраджэнні ідэя індывідуальнай, суб'ектыўнай свабоды ў значнай ступені абмяжоўвалася інтарэсамі агульнага дабра, гаспадарскай парадыгмай, маральнымі дабрачыннасцямі.

Патэнцыйна ідэя свабоды асобы прыкметная ўжо ў творчасці Ф. Скарыны, выявілася ў перакладзе біблейскіх кніг на мову простага народа, вольным звароце з біблейскімі тэкстамі, рацыянальным іх тлумачэнні, у элементах ідэі асобаснага стаўлення да Бога і веры. Мысліцель даў магчымасць чалавеку самастойна інтэпрэціраваць свяшчэнны тэкст.

Ідэалы духоўнай свабоды знайшлі адлюстраванне ў поглядах шматлікіх ідэолагаў Рэфармацыі, у прыватнасці ў іх патрабаванні вольнага тлумачэння Святога Пісання, асабістай веры і ўзгадненні з ёй розуму. Мысліцелі-гуманісты адстойвалі ідэю інтэлектуальнага плюралізму, выступалі за вольны выраз меркаванняў, памяркоўнасць да сваіх ідэйных супернікаў.

Адмысловае значэнне для складанай у этнаканфесійных адносінах дзяржавы – ВКЛ – мела распрацоўваемая мысліцелямі-гуманістамі канцэпцыя рэлігійнай свабоды. Сымон Будны ў сваіх працах заклікаў не канфліктаваць з-за веры. «Не дай Божа, – пісаў ён у кнізе «Аб асноўных артыкулах хрысціянскай веры», – каб ваяваць за веру. Гэта звычай бязбожных людзей» [5, с. 117]. У 1567 г. у Брэсце прыхільнікамі рэфармацыйных рухаў была выдадзена на польскай мове «Гісторыя аб жорсткім ганенні Царквы Божай у Немцах, Францыі, Англіі, Влохах, Гішпаніі і іншых землях...». Кніга стала першым беларускім выданнем, у якім былі рэзка асуджаны канфесійныя ганенні ў краінах Заходняй Еўропы. У «Пяці лістах супраць Скаргі» і іншых сваіх сачыненнях Андрэй Волан у сваю чаргу выступаў з асуджэннем рэлігійных войнаў, даказваў, што ўчынкі вольнага чалавека абумоўлены ўласным сумленнем, а воля з'яўляецца прыроджанай уласцівасцю чалавечай прыроды. Несумнеўным дасягненнем беларускай грамадскай думкі эпохі Адраджэння стала замацаванне ідэй верацярпімасці ў заканадаўстве (Статуты брацтваў, Статуты ВКЛ 1529, 1566 гг.).

Важнай рысай беларускай філасофскай думкі эпохі Адраджэння з'яўляецца фарміраванне маральнага вобліку асобы. Калі артадаксальная хрысціянская этыка зыходзіла з прынцыпу фатальнага заняпаду маральнай прыроды чалавека, няздольнасці пераадолення гэтага заняпаду без дапамогі царквы, то новае, рэнесансна-гуманістычнае вучэнне аб маралі грунтавалася на даверы да натуральнай прыроды чалавека, упэўненасці ў магчымасці яе ўдасканалення пры дапамозе індывідуальных намаганняў. Аснову канцэпцыі асобы стваралі маральныя прынцыпы народнай культуры і безумоўна хрысціянства (яны не былі статычнымітычнай, а праходзіла праз чалавека, пераасэнсоўвалася ім, накладалася на яго зямное быццё). Хрысціянская мараль у эпоху

Рэнесансу страчвае сваю ўсеагульнасць і належыць канкрэтнай асобе дзеля яе персанальнага ўдасканалення.

Развіццё асобасных здольнасцяў выразна прасочваецца ў маральна-хрысціянскай канцэпцыі Ф. Скарыны, які сцвярджаў, што доступ да маральнага ідэалу адкрыты кожнаму чалавеку, паколькі дабрачыннасці можна навучыцца. Мысліцель абгрунтоўваў думку аб асабістай адказнасці чалавека за свае ўчынкі. Важнымі катэгорыямі маральнасці асобы з'яўляюцца, згодна Ф. Скарыне, веды, адукацыя, якія паказваюць чалавеку шлях да індывідуальнага і агульнага дабра, з'яўляюцца асновай дабрачыннасцей, зямнога шчасця. Усхваляў мысліцель такую асобасную якасць як мудрасць. У сваёй прадмове да «прыпавесцяў» прамудрага Саламона , цара ізраільскага ён піша "Хвала і бясконцая пашана мудрасці! Яна — маці ўсіх спраў, настаўнік усякага добрага навыку!» [5, с. 134]. Трэба адзначыць, што маральная канцэпцыя асобы Францыска Скарыны была дзейснай па сваёй сутнасці. Мысляр у Сказанні да «Сабornага паслання Іякава» падкрэслівае: "Мусім не толькі словамі, але і справамі даказваць веру хрысціянскую, стрымлівацца ў словах, убогімі не пагарджаць, жабракам міласціну даваць. Вера без добрых справаў – мёртвая" [5, с. 149].

Францыск Скарына – адзін з заснавальнікаў новага разумення годнасці чалавека, якое, на яго думку, заключаецца не ў сацыяльнай прэстыжнасці (радавітасці, знатнасці), не ў суме матэрыяльных каштоўнасцяў, што належаць чалавеку (маёнтках, грашовых даходах), а ў вышыні чалавечай духоўнасці, інтэлектуальна-маральных якасцях, прафесіяналізме, грамадзянскасці. Высакароднасць трактуецца ім не як спадчынная, а як набытая дабрачыннасць, зместам якой з'яўляецца высокая духоўная культура чалавека.

Трэба адзначыць, што важнай катэгорыяй беларускай рэнесанснай асобы была яе сацыяльнасць у адрозненні ад індывідуалізаванай асобы еўрапейскага Адраджэння. Практычна ўсе тагачасныя грамадскія акцыі – ад працы і вайны да богаслужэння і народных гулянняў – былі з'явамі масавымі не толькі па маштабах, але і па самой сваёй псіхалагічнай сутнасці. Чалавек натуральна падпарадкоўваўся агульным настроям. Самі пачуцці, якія ён перажываў, не былі яшчэ пачуццямі індывідуалізаванымі. Індывідуальнасць толькі пачынала спарадычна выяўляцца, яле не ўсведамлялася як такая, не знаходзіла сродкаў для самарэалізацыі ды і наўрад ці мела вартасць ва ўласных вачах [6, с. 235].

Прызнанне цялеснай сутнасці чалавека з'яўляецца наступным напрамкам развіцця ўяўленняў аб асобе ў беларускай культуры Адраджэння. Ужо ў «Катэхізісе» Сымон Будны пісаў аб падпарадкаваным становішчы душы ў дачыненні да цялеснай субстанцыі, немагчымасці аўтаномнага існавання духа, сцвярджаў адзінства матэрыяльнага і ідэальнага, спрабаваў ўявіць матэрыяльна-цялеснае ў якасці крыніцы ідэальна-духоўнага.

У эпоху Адраджэння радыкальна мяняецца ўяўленне аб вытоках прыгажосці чалавека. Так, прыгажосць Еўфрасінні Полацкай, згодна яе Жыццю, для раннесярэднявечнага чалавека мае незямное паходжанне. Яна – адбітак на твары ўнутранай прыгажосці, якая ў сваю чаргу адлюстроўвае невымоўную і неперадаваемую Божую прыгажосць духу.

Канцэптуалізацыя асобы ў культуры беларускага Адраджэння адбывалася і ў сацыяльна-прававой сферы Вялікага Княства Літоўскага, дзе асноўнымі яе вымярэннямі з'яўляюцца паняцці статуса, грамадзянскай свабоды, волі, сацыяльнага палажэння.

Такім чынам, асоба чалавека ў эпоху Адраджэння пачынае ўспрымацца комплексна, у адзінстве яго духоўных, сацыяльных і цялесных пачаткаў. Галоўнымі адзнакамі працэсу канцэптуалізацыі асобы выступаюць феномен вальнадумства, рэлігійная свабода, хрысціянская маральнасць, сацыяльная дэтэрмінаванасць чалавека, прыняцце чалавечай прыгажосці, цялеснасці. Неабходна адзначыць, што філасофскія катэгорыі свабоды, роўнасці, маральнасці існавалі ў беларускай культуры не проста ў метафізічнай прасторы, а былі сацыяльна замацаваны ў заканадаўстве, філофска-прававых трактатах, літаратуры, што дазваляе нам сцвярджаць сацыяльную дэтэрмінаванасць рэнесанснай асобы.

1. Бердяев, Н. Судьба России / Н. Бердяев. – М., 1990. – 156 с.
2. Баткин, Л.М. Итальянские гуманисты. Стиль жизни и мышления / Л. М. Баткин. – М., 1978. – 345 с.
3. Конан, У.М. Дабро і краса ў творчасці Францыска Скарыны / У.М. Конан // 480 год беларускага кнігадрукавання: матэрыялы Трэціх Скарынаўскіх чытанняў. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – С. 32–35.
4. Скарына, Ф. Выбр. тв. / Ф. Скарына; уклад., прадм., пер. на бел. мову І. В. Саверчанкі. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 110 с.
5. Старажытная беларуская літаратура (XII – XVII стст.) / Уклад, прадм., камент. І. Саверчанкі – Мінск : Кнігазбор, 2010. – 605 с.
6. Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі: у 6 т. / В. Б. Евароўскі [і інш.]; рэд. кал.: В. Б. Евароўскі [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – Т. 2: «Протарэнесанс і Адраджэнне" – 840 с.

УДК 39: 008(476)

# КУЛЬТУРНАЯ САМОРЕПРЕЗЕНТАЦИЯ ПОЛЯКОВ ГРОДНЕНСКОЙ ОБЛАСТИ В 2010-Е ГОДЫ

***Наталья Улейчик***
*Гродно, Беларусь*

Культурно-просветительская деятельность выступает важнейшим фактором формирования этнонациональной идентичности. В статье раскрываются основные направления и формы культурной саморепрезентации поляков Гродненской области в 2010-е гг. Особое внимание уделено деятельности польских национальных общественных объединений.

***Ключевые слова: поляки Гродненской области, этнонациональная идентичность, культурная саморепрезентация, национальные общественные объединения.***

Актуализация проблематики, связанной с этнокультурными процессами в современном мире, сфокусирована, прежде всего, на этнонациональных общностях, их культуре и идентичности. В Республике Беларусь, как и в подавляющем большинстве европейских (и неевропейских) стран структура населения включает этнонациональные общности (русские, поляки, литовцы, евреи, татары, и т.п.), традиционно сосуществующие с белорусами, но отличающиеся особенностями культуры и сохраняющие свою идентичность, специфические культурные потребности. Тем более эта проблематика актуальна для Гродненского региона Беларуси, отличающегося полиэтничностью и поликультурностью. В этом плане несомненный научный и практический интерес представляет культурная саморепрезентация поляков, имеющих давнюю историко-культурную традицию на Гродненщине.

Основной формой институционализации этнических групп являются национальные общественные объединения, призванные консолидировать представителей своей общности и сохранять свою идентичность через культурно-просветительскую деятельность. В этой связи анализ такой деятельности опирается на характеристику особенностей актуального культурного облика поляков Гродненской области, их идентичности и вытекающими из особенностей культуры задач.

В Гродненкой области поляки являются второй после белорусов этнонациональной группой и составляли в 2009 г. 230,810 тыс. или 78,4 % от общей численности поляков Беларуси и 21,5 % жителей Гродненской области [4, с. 16]. Тем не менее, период, прошедший между переписями населения 1999–2009 гг., характеризуется